УДК 272»15/16»

# РЭЛІГІЙНЫ ПЕРАСЛЕД І ПАКУТНІЦТВА Ў XVI–XVII стст.

**Клімуць Лада Яраславаўна**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Магілёў, Беларусь)

*Артыкул разгледжвае феномен рэлігійных пераследаў і пакутніцтва ў Еўропе ў XVI–XVII стст. на прыкладзе каталікаў, пратэстантаў і*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*анабаптыстаў. Аўтар звяртае ўвагу на каштоўнасць параўнальнага падыходу і неабходнасць улічваць агульны сацыяльны кантэкст таго часу.*

У XVI ст. перасэнсоўваецца хрысціянскае пакутніцтва: веруючыя людзі былі гатовыя паміраць за свае погляды. У залежнасці ад краіны каталікаў і пратэстантаў праследавалі за іх веру. Вынікам рэлігійных праследаванняў у Еўропе за XVI–XVII стст. стала 5000 смерцяў [6, с. 261]. Увекавечванне гэтых смерцяў мартыралогамі і вернікамі адыграла значную ролю ў фарміраванні асобных хрысціянскіх традыцый ў Еўропе ранняга Новага часу.

Калі прасачыць смяротныя пакаранні па канфесіях, то можна ўбачыць, што 1520–1530-я гг. – гэта пакаранні анабаптыстаў, 1540–1550-я гг. – кальвіністаў, а пасля 1580 г. – каталікаў. Амаль 500 вядомых нам пакаранняў анабаптыстаў адбыліся ў Цэнтральнай Еўропе, у тым ліку Швейцарыі і Багеміі, пачынаючы з 1525 г. [1, с. 118–119]. У Францыі Парыжскі парламент з 1563 па 1543 г. вынес толькі 23 смяротныя прысуды, а ў 1544–1549 гг. – 112 [4]. Калі браць не толькі Еўропу, то каталікаў сярод пакутнікаў было больш. У Японіі ў пачатку XVII ст. былі пакараныя смерцю больш за 2100 каталікаў, большая частка – у перыяд з 1614 па 1639 г. [3, с. 184–185]. У Еўропе пакутнікамі лічыліся, напрыклад, тыя прадстаўнікі духавенства, якія загінулі падчас паўстання ў Нідэрландах і французскіх рэлігійных войн. Сярод самых вядомых можна назваць 19 горкумскіх пакутнікаў, забітых у 1572 г

Гэта можна назваць праследам і пакутніцтвам з нашага сённяшняга пункту погляду. І з пункту гледжання ахвяр гэтых праследаў таксама. Але не з пункту погляду тых, хто выносіў выракі. На іх погляд, яны абаранялі грамадства ад злачынцаў, у дадзеным выпадку рэлігійных. Так было не толькі ў каталіцкіх краінах, у якіх існавала даўняя традыцыя абараняць царкву ад унутраных і знешніх ворагаў, але і ў лютэранскіх, кальвініcцікх і г. д., дзе прадпрымаліся юрыдычныя дзеянні супраць дысідэнтаў.

Таму, калі мы разглядаем феномен адраджэння хрысціянскага пакутніцтва ў перыяд Рэфармацыі, трэба заўсёды помніць пра ўмоўны характар такіх маральных катэгорый, як праслед і пакутніцтва. У дадзеным выпадку найбольш карысным быў бы кампаратыўны падыход, пры якім разглядаецца не асобная канфесія, а грамадства ў цэлым. Безумоўна, па колькасці пакутнікі былі выключэннем у тым, што паміралі за свае погляды. Але змест іх поглядаў, якіх яны так моцна прытрымліваліся, аб'ядноўваў іх з іншыі веруючымі.

У той час нікому не магло прыйсці ў галаву сумнявацца наконт неабходнасці выпраўляць тых, хто адышоў ад вучэння царквы. Толькі тых, хто не хацеў пакаяцца, царкоўны суд, якому па кананічнаму праву нельга было праліваць кроў, перадаваў свецкаму суду для пакарання. Трэба адзначыць, што суровыя, часцей за ўсё смяротныя, пакаранні не былі чымсці выключным, таму што большасць злачынстваў каралася смерцю. У гэтым была свая юрыдычная паслядоўнасць: калі здрадніка каралі смерцю за здраду людзям, то наколькі больш вінаваты ерэтык, які здрадзіў Богу і царкве.

Праслед за рэлігійныя злачынствы пратэстантаў, анабаптыстаў ці каталікаў у Францыі, Нідэрландах і Англіі кантраляваўся ўладай і меў падтрымку закона і мясцовай палітычнай адміністрацыі. Але ажыццяўляць праслед у рэчаіснасці было вельмі цяжка. Тэрыторыі краін былі занадта вялікімі, сродкі камунікацыі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

марyднымі, мясцовыя ўлады не заўсёды супрацоўнічалі. Таму не трэба думаць, што, калі ў краіне было мноства ўказаў супраць ерэтыкоў, гэта абавязкова азначае, што іх усіх выкаранілі.

У сучасных даследаваннях гісторыкі развенчваюць міф аб заўсёды крывавых і жорсткіх судах. Пры Карле V і Філіпе II у Нідэрландах было пакарана больш людзей па рэлігійных прычыных, чым у астатняй Еўропе. Але, калі ўзяць увогуле дзейнасць інквізіцыі ў XVI–XVII стст., то выходзіць, што менш за 1% насельніцтва падазравалі ў ерасі [2, с. 190]. Адзін з самых заўзятых інквізітараў XVI ст. Пітэр Цітэльманс правёў 20 гадоў, раз'язджаючы па Францыі, і судзіў ад 1100 да 1600 спраў ерэтыкоў, але пакараны смерцю былі толькі 127, г. зн. 8-11% [6, с. 265]. На самай справе, ён і Савет Фландрыі парушылі закон, выратаваўшы пакаяўшыхся анабаптыстаў у 1550-х гг. І ўвогуле вядома, што Цітэльманс умешваўся ў справы свецкіх уладаў, каб перашкодзіць вынясенню смяротнага пакарання. Паказальны выпадак з рэлігійным эксцэнтрыкам Барталаме Санчэсам, якога з дзесятак разоў выклікалі ў суд у 1553–1558 гг. на дзіва цярплівыя інквізітары. Яны спрабавалі зразумець, ці не з'яўляецца ён ментальна хворым і пераконвалі і прасілі яго змяніць погляды і прымірыцца з царквой.

Колькі ні пішы законаў, яны будуць проста літарамі на паперы, калі яны не выконваюцца на практыцы. Таму ў даследаваннях гісторыкам трэба не проста спасылацца на існаванне закону, а правяраць, у якой ступені ён працаваў (калі ёсць архіўныя матэрыялы з канкрэтнымі данымі). Многае ў ажжыцяўленні законаў залежала ад мясцовых уладаў. Аднак відавочна, што рэлігійны пераслед не быў пастаянным працэсам, ён адбываўся хвалямі і быў звязаны з пэўнымі абставінамі. Мясцовы кантэкст уносіў свае карэктывы. Так, у Англіі з 1535 па 1680 г. было пакарана смерцю 314 каталікаў, з іх толькі чатыры жанччыны [5, с. 191]. Гэта лагічна, таму што ў асноўным абвінавачванні датычыліся святароў, а яны былі мужчынамі. Цікава, што некалькі жанчын заявілі, што яны трымаюцца тых жа поглядаў і павінны быць пакараны такім жа чынам, аднак суддзі мелі сваё ўяўленне аб ступені іх віны.

Адраджэнне хрысціянскага пакутніцтва ў XVI ст. звязана не толькі з існаваннем законаў аб рэлігійных злачынствах, але і з існаваннем людзей, якія гатовыя былі памерці, але не адракацца ад сваёй веры. Паколькі гэтыя людзі лічылі сябе несправядліва абвінавачанымі, прысуд для іх быў пакутніцтвам, а не пакараннем за злачынства. Ідэя пакутніцтва была адзінай спадчынай для ўсіх трох названых у прадстаўленым дакладзе канфесій, гэтыя ідэі захоўваліся яшчэ з Сярэднявечча.

У цэнтры хрысціянства знаходзіцца пакутнік – Ісус Хрыстос, чые пакуты былі істотнымі для логікі выратавання душы. У сярэднявечных цэрквах галоўным вобразам быў распяты Хрыстос. І пратэстанты ў сваіх ідэях не супраць Хрыста выступалі, таму ідэя пакутніцтва не была для іх чужой.

Нездарма галоўнай рэлігійнай практыкай было пераймание Хрыста, і так называўся галоўны бэстсэлер пачатку кнігадрукавання ў Еўропе. У пачатку XVI ст. хрысціяне жылі ў рэлігійнай культуры, дзе ім пастаянна нагадвалі пра пакуты і смерць Хрыста, пра дабрадзейнасць пакут і пра жыццё святых. У пратэстанцкай царкве ішло многа дактрынальных спрэчак, і выраз "лепш памерці, чым згадзіцца" набываў канкрэтнае ўвасабленне. Уласныя пакутнікі дапамагалі зама-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цавацца розным хрысціянскім напрамкам, якія станавіліся асобнымі канфесіямі са сваёй дактрынай, падмацаванай смерцю сваіх пакутнікаў.

## Літаратура


1. Clasen, C. P. Executions of Anabaptists, 1525–1618: a research report. / C. P. Clasen // Mennonite Quarterly Review. – № 47 (1973). – P. 115–152.
2. Goosens, A. Les inquisitions modernes dans Les Pays-Bas meridionaux (1520–1633): in 2 vols / A. Goosens. – Brussels: Editions de l'Universit´e de Bruxelles, 1997–8. – Tome 2: Les victims. – 252 p.
3. Hsia, R.P. The world of Catholic renewal, 1540–1770 / R.P. Hsia. –Cambridge: Cambridge University Press, 2005. – 284 p.
4. Monter, W. Judging the FrenchReformation: heresy trials by sixteenth-century parlements / W. Monter. – Cambridge, MA: Harvard University Press, 1999. – 336 p.
5. Nuttall, G. F. The English martyrs 1535–1680: a statistical review / G. F. Nuttall // Journal of Ecclesiastical History. – №22 (1971). – 191–197.
6. The Cambridge History of Christianity. – Cambridge University Press, 2008. – V. 6: Reform and Expansion 1500–1660 / ed. by R. Po-Chia Hsia. – 2008. – 749 p.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова